МІНІСТЭРСТВА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
220030, г. Мінск, вул. Гарадскі Вал, 4

13.09.2017 № 21/Кол-4837эл

220036, Мінская вобласць,
г.
@gmail.com
(для інфармавання зацікаўленых)

У Міністэрстве ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь у межах кампетэнцыі разгледжаны «калектыўны зварот аб удасканальванні заканадаўства аб свабодзе сходаў», накіраваны ў адрас Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Згодна з Міжведамасным планам па рэалізацыі рэкамендацый, прынятых Рэспублікай Беларусь па выніках праходжання другога цыклу універсальнага перыядычнага агляду ў Савеце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па правах чалавека, і рэкамендацый, адрасаваных Рэспубліцы Беларусь дагаворнымі органамі па правах чалавека, на 2016 - 2019 гады, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 24 кастрычніка 2016 г. № 860, Міністэрству замежных спраў, Міністэрству ўнутраных спраў і Нацыянальнаму цэнтру заканадаўства і прававых даследаванняў даручана на працягу 2017-2018 гг. правесці «вывучэнне міжнароднага вопыту па пытанні аб правядзенні масавых мерапрыемстваў», а таксама «разгляд мэтазгоднасці яго ўліку ў нацыянальнай практыцы».

Акрамя таго, адзначаем, што права заканадаўчай ініцыятывы можа быць рэалізавана грамадзянамі самастойна ў парадку, устаноўленым Законам Рэспублікі Беларусь ад 26 лістапада 2003 года «Аб парадку рэалізацыі права заканадаўчай ініцыятывы грамадзянамі Рэспублікі Беларусь».

Прынятае рашэнне Вы маеце права абскардзіць у судзе.

Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення –
начальнік упраўлення аховы правапарадку
галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку
і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Д.А.Кур`ян

21 Зінчанка 218737
13092017 Па (аб ММ)